**ВЫВУЧЭННЕ, РЭКАНСТРУКЦЫЯ І ЗАХАВАННЕ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ І АЎТЭНТЫЧНАГА ФАЛЬКЛОРУ Ў СУЧАСНЫМ ГРАМАДСТВЕ**

ШАНОЎНАЕ СПАДАРСТВА!

Паважаныя ўдзельнікі канферэнцыі, замежныя госці, выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты і аспіранты Універсітэта, калегі з іншых навучальных установ і навуковых цэнтраў, удзельнікі народных мастацкіх калектываў!

Мне вельмі прыемна звярнуцца да Вас з урачыстай нагоды адкрыцця VIII міжнароднай канферэнцыі «Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання»!

Традыцыйная культура Беларусі існуе на працягу многіх стагоддзяў і з'яўляецца адным з сапраўдных брэндаў у прасторы сучаснай сусветнай культуры. На працягу XX стагоддзя і ў XXI стагоддзі адчувальна расце ўвага даследчыкаў да традыцый беларусаў, народнай беларускай культуры.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў з'яўляецца значным цэнтрам вывучэння, рэканструкцыі і захавання створаных нашымі продкамі ведаў, уменняў, творчых прыёмаў, мастацкіх праяўленняў, абрадаў, свят і іншых традыцыйных каштоўнасцей. Вялікае значэнне для фарміравання свядомасці і культуры сучаснага чалавека мае жыццёвая мудрасць, этыка, экалагічнасць светапогляду беларускага народа, якія выпрацоўваліся стагоддзямі.

У нашым Універсітэце не толькі цікавяцца традыцыйнай беларускай культурай і шануюць яе. Вялікая ўвага надаецца падрыхтоўцы спецыялістаў у розных галінах беларускага народнага мастацтва (народных спевах, народным танцы, народным дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, народным тэатры, традыцыйных святах і іншых напрамках і спецыяльнасцях), зборы і захаванні артэфактаў ў музеях і экспазіцыях, спецыялістаў у галіне этналогіі.

Ва Універсітэце вядзецца мэтанакіраваная праца па рэканструкцыі, навуковым апісанні і інтэрпрэтацыі разнастайных з'яў народнай культуры. Сярод славутых імен беларускіх фалькларыстаў з гонарам узгадаем вучоных нашага Універсітэта Міколу Грынчыка, Івана Цішчанку, Уладзіміра Грома і іншыя. Выдадзены манаграфіі і зборнікі работ, абаронены дысертацыі па адпаведнай тэматыцы. Навуковы аналіз гістарычнага і сучаснага стану традыцыйнай беларускай культуры, аўтэнтычнага фальклору дае падставу для вызначэння прыярытэтаў культурнага і грамадскага развіцця нашай краіны, вырашэння праблем адукацыі, выхавання, інкультурацыі, інфармацыйнай бяспекі, экалогіі, дэмаграфіі і іншых.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў славуты сваімі мастацкамі калектывамі, у творчай дзейнасці якіх знайшлі ўвасабленне разнастайныя з'явы і формы традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў. Прыкладам з'яўляецца вакальна-харэаграфічны ансамбль «Валачобнікі», якім на працягу 30 год кіраваў вядомы даследчык, заслужаны работнік культуры БССР С.І. Дробыш, Капэлу беларускіх народных духавых інструментаў «Гуды» (мастацкі кіраўнік — прафесар І. А. Мангушаў), ансамбль «Грамніцы» (мастацкі кіраўнік — прафесар У. К. Зяневіч), ансамбль кафедры харэаграфіі (пад кіраўніцтвам загадчыка кафедры, прафесара С. В. Гуткоўскай) і многія іншыя.

Зразумела, што ўся гэтая шматгранная праца па захаванні і развіцці традыцыйнай беларускай культуры, якая ажыццяўляецца ва Універсітэце, робіцца пры падтрамцы органаў дзяржаўнага кіравання, за што мы ім вельмі удзячныя. Створаныя дзяржавай ўмовы для ўключэння нацыянальнай культурнай спадчыны ў жыцце сучаснага грамадства спрыяюць дзейнасці Універсітэта як асяродка вывучэння і выкарыстання здабыткаў традыцыйнай мастацкай культуры, а таксама яе кадравага забеспячэння гэтай дзейнасці.

Шчыра жадаю плённай працы, вялікіх поспехаў, навуковых і творчых дасягненняў усім удзельнікам канферэнцыі, нашым гасцям з Расіі і іншых краін, народным калектывам, якія завіталі да нас і бяруць удзел як у навуковай рабоце, так і ў творчай, культурная праграме канферэнцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў
Юрый Паўлавіч Бондар